«ТАЙНАЯ ВЯЧЭРА» З ГЛЫБОКАГА

прадстаўлена на выставе «У промнях веры хрысціянскай»

Нават калі б не было зараз вялікіх святкаванняў да 1025-годдзя Хрышчэння, то ўсё роўна гэтую выставу Нацыянальнаму гістарычнаму музею трэба было б зрабіць. Столькі твораў у фондах музея, якія паказваюць, наколькі беларуская культура была знітаваная з хрысціянскай традыцыяй праз увесь шлях свайго развіцця! Вось і міністр культуры Барыс Святлоў адзначыў, што наогул біблейскія сюжэты далі штуршок развіццю сусветнага мастацтва. «Які б сюжэт мы ні ўзялі, які б мастацкі жанр ні разглядалі, — усё адно звяртаемся да хрысціянскіх сюжэтаў, якія прасякнулі нашу свецкую культуру. І Беларусь не выключэнне. Тут ёсць магчымасць пабачыць на свае вочы, наколькі багатая беларуская зямля помнікамі мастацтва духоўнага зместу. Нашу культуру нельга аддзяліць ад культуры хрысціянскай».

Хрысціянства, якое на працягу стагоддзяў распаўсюджвалася на нашых землях, істотна паўплывала на развіццё культуры. Тое, што можна ўбачыць на выставе, якраз і сведчыць пра гэта. Артэфакты, якія нясуць думку, якія дораць святло і нават даюць энергію — калі хочаце, то і канкрэтнага чалавека. Напрыклад таго, хто насіў на грудзях просценькі нацельны крыжык, які дайшоў з XIV стагоддзя. У музея ёсць свая калекцыя нацельных крыжыкаў, якую набылі ў аднаго з калекцыянераў. Усе разам яны паказваюць, наколькі трапяткое стаўленне было ў людзей да гэтага сімвала — крыжыкі маглі быць розных формаў, памераў, з упрыгожаннямі і без. Яны, напэўна, у нечым былі вельмі падобныя на сваіх гаспадароў, якія не ўтойвалі свайго веравызнання. Цяпер гэта сведчанні эпох, што стваралі нашу культуру хрысціянскай.

Нездарма на выставе нават вітрыны для экспанатаў створаны ў выглядзе крыжоў. У адным, напрыклад, размясціліся рэчы, звязаныя з дзейнасцю царквы. Гэта рэчы XIX стагоддзя, цікавыя тым, што паходзяць з адной царквы Нясвіжскага раёна. Посуд, якім карысталіся падчас літургіі, ручное кадзіла XII-XIII стагоддзяў — гонар калекцыі музея. Нават вопратка святароў, прадстаўленая на выставе, дапамагае стварыць асаблівы дух часоў, якія яднаюцца адной галоўнай ідэяй: імкнення чалавека адпавядаць вобразу Божаму.

Найперш пра гэта сведчаць абразы. Самыя каштоўныя — тры творы на зялёным аксаміце, сярод якіх адзін з самых старых абразоў у зборы музея (належыць да XVII — пачатку XVIII стагоддзяў) — «Хрэшчэнне ў Іардане». Але асаблівай цеплынёй напаўняюць абразы, што належаць сабору ў гонар Нараджэння Маці Божай з Глыбокага. Цыкл з 12 абразоў XIX стагоддзя, які прадстаўляе сюжэты Хрыстовых пакут, прыцягвае адмысловай падачай сюжэтаў. Нават свая версія «Тайнай вячэры» была ў Глыбоцкай царкве! На выставу абразы трапілі дзякуючы музейным рэстаўратарам, якія далі ім другое жыццё, а потым зноў вернуцца дадому. Цікавасць да гэтага цыкла была і з боку навукоўцаў: у Беларусі мелі месца розныя традыцыі іканапісу, можа, таму і ўзнікла гэтая адмысловасць, аднак аднесены творы з Глыбокага ўсё ж да праваслаўнай культуры. Нашы продкі жылі на мяжы сутыкнення лацінскага і візантыйскага светапоглядаў. І дагэтуль у Беларусі некалькі хрысціянскіх канфесій, якія імкнуцца існаваць у ладзе. Нездарма вітальнае слова на адрас выставы прагучала ад імя архіепіскапа, мітрапаліта Мінска-Магілёўскага Тадэвуша Кандрусевіча.

— Бог стварыў свет прыгожым, і з кнігі «Быццё» мы ведаем, як ён сказаў: «І гэта добра». І чалавек, які створаны па вобразе Божаму, імкнецца гэтую прыгажосць убачыць і памножыць, падобна вялікаму творцу Госпаду, — адзначыў протаіерэй Аляксандр Шымбалёў. — Царква як цела Хрыстова і як супольнасць веруючых у Бога людзей гарманізуе жыццё: мы тут бачым прыгожыя рэчы.

Усяго на выставе змешчана 320 экспанатаў, якія належаць музею. Але прадстаўлены і вельмі цікавыя творы, якія жылі сваім храмавым жыццём, натхняючы вернікаў на малітву. І цяпер жывуць жыццём асаблівым.

Ёсць сваё новае жыццё і ў факсімільнага выдання Полацкага рукапісу XII стагоддзя. Кніжка сустрэне ля ўваходу. Яе можна пагартаць — дакрануцца да вытокаў беларускага хрысціянства ў нейкім сэнсе. Ініцыятар выдання Уладзімір Грозаў, старшыня дабрачыннага фонду «Сям'я. Адзінства. Айчына», патлумачыў:

— Гэтая кніга сведчыць пра тое, як даўно нашы продкі ішлі з Богам. Дарэчы, у некаторых краінах адукаванай Еўропы Святое пісанне прыйшло на некалькі стагоддзяў пазней — у Германію і Францыю. Гэты рукапіс каштоўны і тым, што можна адчуць жывую мову нашых продкаў, як яны размаўлялі з Богам. Але ён быў разрабаваны ў XVIII стагоддзі, падзелены, і часткі яго апынуліся за мяжой. Адна з частак захоўваецца ў бібліятэцы ў Маскве, а другая — у бібліятэцы Санкт-Пецярбурга. Дзякуючы разуменню расійскага боку (што гэта праект не дзеля камерцыйных мэтаў) і дзякуючы клопату розных беларускіх дзяржаўных структур паўстала гэтая з'ява...

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ На слыху

АДКУЛЬ У ЖАБРАКА КВАТЭРА?

У Аршанскім раёне супрацоўнікі падатковай вылічылі грамадзяніна, які траціў значна больш грошай, чым зарабляў, мяркуючы па звестках, пададзеных у падатковую інспекцыю. На аўкцыёне ён прыкупіў нерухомасць, а грошы адкуль?

Інспектарамі было выяўлена перавышэнне расходаў над даходамі больш чым на 85 млн рублёў. У выніку чаго грамадзяніну прад'явілі да выплаты 10 мільёнаў рублёў падаходнага падатку.

Правяраюць і іншых грамадзян, якія набылі дарагую маёмасць маючы невысокія даходы. Ужо запатрабавана 15 дэкларацый. Памер перавышэння выдаткаў над атрыманымі даходамі склаў амаль 252 мільёны рублёў. Грамадзянам былі прад'яўлены да выплаты падаходны падатак у суме 33 мільёны рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Организация ЗАКУПИТ
в больших объемах
ЗАМОРОЖЕННУЮ
2-ой категории СВИНИНУ
у ИП и юр. лиц
по безналичному расчету
Тел.: 8 044 7888 503
ООО «Евроторг» УНП 101168731

■ Інфарм-укол

У САСУДАЎ ШТОСЬЦІ З ТОНУСАМ

Няшчасныя пацыенты трацяць шмат сіл і сродкаў, аднак не могуць знайсці прычыну свайго паталагічнага стану. Між тым яны пакутуюць ад нейрацыркуляторнай дыстаніі — расстройства рэгуляцыі сасудзістага тонусу.

Паводле слоў **урача-неўролага 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Зоі КУРС**, вядома некалькі тыпаў нейрацыркуляторнай дыстаніі:

1) кардыялагічны (боль у сэрцы, сэрцабіццё, заміранне ў сэрцы, перабоі ў сэрцы);

2) рэспіраторны, або дыхальны (пачашчанае дыханне, немагчымасць зрабіць глыбокі ўдых, нечаканыя глыбокія ўдыхі);

3) дысдынамічны (ваганні артэрыяльнага ціску, павышэнне або паніжэнне);

4) тэрмарэгуляторны (ваганні тэмпературы цела, павышэнне да 37-38°С або паніжэнне менш за 35 градусаў можа быць пастаянным, працяглым або кароткім, як прыступ);

5) дыспепсічны (боль у жываце, млосць, ваніты, адрыжка, парушэнне маторнай функцыі кішэчніка, звязаныя з нервовым напружаннем і інш.).

Практычна ва ўсіх хворых адзначаюцца неўралагічныя расстройствы: слабасць, хуткая стамляльнасць, плаксівасць, раздражняльнасць, галаўны боль.

Пры з'яўленні такіх сімптомаў неабходна абследавацца ў эндакрынолага, неўролага і кардыёлага. Каб пераканацца ў тым, што гэта дыстанія, а не неўроз або тырэатаксікоз, або ішэмія, або парок сэрца, або міякардыт, трэба зрабіць:

- электракардыяграму;
- рэнтгенаграфію грудной клеткі;
- эхакардыяграфію;
- артастатычную пробу;
- аналіз крыві на гармоны;
- сутачнае манітарыраванне артэрыяльнага ціску;
- ультрагук органаў брушной поласці і шчытападобнай залозы.

Нягледзячы на тое, што гэты стан не небяспечны і не заразны, лячыць яго трэба. Спачатку трэба ліквідаваць прычыну. Калі прычына — працяглы стрэс, трэба неяк папрацаваць у гэтым кірунку; калі вінаватая інфекцыя — значыць, вылечыць ачаг, калі шкодныя ўмовы працы — змяніць працу...

Добры эфект дае псіхатэрапія. Пацыенту неабходна тлумачыць, што яго жыццю нішто не пагражае, прагноз спрыяльны, выздараўленне магчымае. Добра, калі такі пацыент гатовы займацца аўтатрэнінгам. Можна прымяняць і прызначаную медыкаментозную тэрапію. Прымяняецца і фітатэрапія. Рэкамендуецца трава валяр'яну, сардэчніку, зборы, якія нармалізуюць работу сардэчна-сасудзістай сістэмы. Прызначаюць і фізіятэрапію (электрасон, электрафарэз), бальнеатэрапію (радонавыя, азотныя, вуглякіслыя ванны, душы, абгортванні і абліванні), масаж шыйнага і груднога аддзелаў пазваночніка.

Паколькі такія пацыенты адчувальныя да змен надвор'я, часта для падтрымання жыццядзейнасці ім неабходны адаптагены — прэпараты расліннага паходжання, якія танізуюць цэнтральную нервовую сістэму, паляпшаюць трываласць арганізма, яго супраціўленне стрэсам і інфекцыйным захворванням. Адаптагены — гэта настойкі жэньшэню, элеўтэракоку, араліі, лімонніку. Настойка жэньшэню прымяняецца і пры паніжаным, і пры павышаным ціску, паколькі нармалізуе яго, астатнія пералічаныя настойкі прымяняюцца пры паніжаным ціску. Адаптагеннымі вартасцямі валодаюць прэпараты з незакасцянелых рагоў марала, ізюбра або плямістага аленя. Аднак гіпертонікам прымяняць іх трэба з асцярожнасцю, пасля кансультацыі з урачом. Паказана і санаторна-курортнае лячэнне.

ЛАД ЖЫЦЦЯ

Пры нейрацыркуляторнай дыстаніі гіпертанічнага тыпу неабходна трымацца спецыяльнай гіпатэнзіўнай дыеты. Абмежаваць ужыванне солі і вадкасці, больш ужываць гародніны і садавіны, павялічыць паступленне такіх мінералаў, як калій і магній. Можна замяніць звычайную соль хларыдам калію. Такія заменнікі солі прадаюцца ў аптэках. Абавязкова трэба сачыць за вагой. Тым жа, хто пакутуе ад нейрацыркуляторнай дыстаніі гіпатанічнага тыпу, рэкамендуецца выпіваць кубак моцнай кавы або гарбаты раніцай і ў сярэдзіне дня.

Прафілактыка нейрацыркуляторнай дыстаніі заключаецца ў вядзенні здаровага ладу жыцця, рэгулярных занятках спортам і ўменні пераадольваць стрэсы. Абавязкова трэба высыпацца, харчавацца разнастайна і не менш за 4 разы на дзень. Трэба гуляць на свежым паветры, і адмовіцца, вядома, ад шкодных звычак.

Святлана БАРЫСЕНКА

Даты Падзеі Людзі

1506 год — у 1502-м, 1503-м і асабліва ў 1505-м годзе ўкраінскія і беларускія землі падвяргаліся нападам крымскіх татараў, якія разбуралі паселішчы каля Мінска, Слуцка, Навагрудка і іншых гарадоў. У 1506 годзе татары праз Брагін, Мазыр, Петрыкаў накіраваліся да Клецка, Мінска, Ліды, Ашмян, Ваўкавыска, Гродна. Як мяркуецца, 31 ліпеня каля Клецка 10-тысячнае беларускае войска баяраў на чале з маршалкам дворным Міхаілам Львовічам Глінскім і гетманам Станіславам Пятровічам Кішкам сышліся з татарамі на берагах ракі Лані. Навагрудска-мінскае апалчэнне адразу перайшло ў наступленне. Пасыпаліся на супрацьлеглы бераг стрэлы, дзіды, ядры. Крымчакі адказалі тым жа. Абодва бакі, не сутыкаючыся, змагаліся тры гадзіны. Нарэшце Глінскі ўдарыў у тыл татарам і раздзяліў іх палкі на дзве часткі. Сярод крымчакоў пачалася паніка. Не вытрымаўшы моцнага націску, яны пабеглі. Апалчэнне на чале з Глінскім пачало іх праследаваць. «Князь жа Міхайла з усім войскам гнаўся за імі, ловячы і забіваючы, да ракі Цапры» і далей. «Мноства іх злавілі ды забілі і вярнуліся да Клецка, ведучы з сабою шмат палонных. І, напоўніўшы рукі золатам ды срэбрам, і зброяй, і адзежаю, і коньмі дарагімі, у невымоўнай радасці і весялосці тую ноч пераначавалі спакойна», паведамляе гістарычны дакумент. Было ўзята ў палон 3 тысячы татараў. Паводле гістарычных звестак, частку іх пасялілі ў Клецку і вакаліцах. Пераможцы вызвалілі каля 40 тысяч палонных, якіх татары збіраліся адвесці ў Крым. Войску М. Глінскага дасталася таксама 30 тысяч коней з былога татарскага войска. Перамога беларускага войска пад Клецкам у 1506 годзе мела вялікае значэнне ў гісторыі Беларусі. Пасля разгрому крымскіх татараў у бітве ля Клецка татарскія напады на Беларусь у такім маштабе, як у пачатку XVI ст., ужо не адбываліся. У жніўні 1996 года ў Клецку ў гонар 490-й гадавіны бітвы быў устаноўлены помнік — Курган і крыж на ім.

1817 год — нарадзіўся (вёска Кахановічы, зараз Верхнядзвінскі раён) Ігнат Храпавіцкі, беларускі фальклярыст. Упершыню ў беларускай фальклярыстыцы выказаў думку пра гістарызм фальклору, вывучаў асаблівасці фальклорнай мовы. На падставе ўласнага збору народных твораў Віцебшчыны ў альманаху «Рубон» апублікаваў працу «Погляд на паэзію беларускага народа», у якой змешчаны першая гісторыка-параўнальная характарыстыка беларускага фальклору, пераклады на польскую мову беларускіх народных песень, гістарычныя дакументы. Рыхтаваў да друку «Поўны беларускі збор песень», для якога распрацаваў класіфікацыю, збіраў тэксты. Быў удзельнікам распрацоўкі праекта адмены прыгоннага права (1850), членам губернскага папячыцельства дзіцячых прытулкаў, узначальваў Віцебскае таварыства сельскіх гаспадароў. Памёр у 1893 годзе.

1938 год — 75 гадоў таму нарадзіўся Рэшат Ібраімавіч Фурункжыеў, беларускі вучоны ў галіне інфарматыкі і тэхнічнай кібернетыкі, доктар тэхнічных навук (1972), прафесар (1974). Аўтар навуковых прац па стварэнні матэматычных і праграмных сродкаў мадэлявання і аптымальнага праектавання дынамічных сістэм, мехатронікі, віртуальным праектаванні сістэм актыўнай бяспекі, вібраабароны і стабілізацыі транспартных сродкаў.

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, празаік, публіцыст:

«Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы — час — мае вечнага свайго дапаможніка — працу».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Мудрагель. Гоні. Тор. Акт. Нуда. Вена. Рана. Кора. Авал. Канцлагер. Сіната. Хна. Ната. Сінкопа. Ара. Суд. Мор. Дыктар. Чынсьі. Жабо. Зуб. Трос. Барда. Анал. Рагрод. Дата. Зад. Рэнтген. Авангост. Ата. Пуаро. Кола. Кадр. Сатурн.

Па вертыкалі: Абаранак. Абруч. Доўга. Аміл. Таросе. Бура. Арбізона. Рост. Барадда. Вагранка. Парад. Кавор. Акалот. Ліза. Ясь. Лідар. Трэст. Дом. Анды. Знарх. Кут.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.22	21.09	15.47
Віцебск	5.05	21.05	16.00
Магілёў	5.12	20.59	15.47
Гомель	5.15	20.49	15.34
Гродна	5.38	21.23	15.45
Брэст	5.45	21.17	15.32

Месяц

Апошняя квадра 29 ліпеня. Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Емяльяна, Івана.*
К. *Алены, Ігната, Любаміра, Рамана.*



Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Фатограф на вяселлі:

— Ну і дзе ж наша шчаслівая пара?

Адзін з гасцей:

— Ды вось жа яны: нявеста і яе мама...

Вельмі сквапны хлопец усё ж такі знайшоў дзяўчыну, якая любіць гваздзікі.

У маршрутцы.

— На святлафоры можна выйсці?

— У гэтай маршрутцы можна ўсё! Калі ўсе скінуцца, наогул на мора паедзем!

Чым цішэй сядзіць дзіця ў суседнім пакоі, тым даражэйшы будзе рамонт.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.538. Індэкс 63850. Зак. № 3245.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 30 ліпеня 2013 года.